студэнтаў. Самыя разнастайныя пытанні задаюць яны педагогу: па якіх прынцыпах і правілах жыць, што з'яўляецца больш важным — матэрыяльныя ці духоўныя каштоўнасці, як стаць па-сапраўднаму шчаслівым, як пазбавіцца ад дурных звычак і інш.

Студэнт шукае магчымасць угледзець у выкладчыку не толькі чалавека, які ведае і разумее жыццё, але і яго сімпатыі і антыпатыі, этычныя, эстэтычныя і сацыяльныя ідэалы. Для навучэнцаў вельмі важна зразумець, наколькі цікавай і захапляючай будзе выбраная прафесія. Толькі тады яны пераканаюцца ў правільнасці свайго выбару — стаць сацыяльным педагогам.

Сацыяльная работа заснавана на альтруізме і накіравана на тое, каб дапамагчы людзям ва ўмовах асабістага і сямейнага крызісу паўсядзённага жыцця, а таксама па магчымасці грунтоўна дапамагчы вырашыць іх праблемы.

Як бачым, неабходны спецкурс, які дапаможа студэнтам зарыентавацца на работу з сям'ёй. Менавіта ў сям'і адбываецца фарміраванне духоўнага светаадчування і развіцця дзіцяці.

Спецкурс дапаможа студэнтам прафесійна авалодаць вопытам выхавання і развіцця дзіцяці ў сям'і, убачыць магчымасці і патэнцыял сям'і ў мастацкім выхаванні.

Практычныя заняткі маюць намер выкарыстання і ўжывання разнастайных методык: жывых вобразных апісанняў падзей і эпізодаў дзяцінства, творчых расказаў, гульняў і інш. Мэта такіх заняткаў — стымуляванне псіхічных працэсаў уяўлення і памяці, заахвочванне студэнтаў набываць веды, уменні і навыкі самастойным шляхам. Заданні разлічаны на развіццё уменняў адчуваць і асэнсоўваць перажыванні і мары, напрыклад: «у дзяцінстве мне больш за ўсё падабалася...», «у вольны час я з ахвотаю перачытаў бы кнігі, якія мне чыталі ў дзяцінстве...». Яны стымулююць дзіцячую моўную творчасць, фантазёрства, узнаўляюць небыліцы дашкольнага дзяцінства.

Магчыма выказаць здагадку, што элементарныя формы эстэтычных адносін да свету ўласцівы ўсім дзецям, але неабходны пошук шляхоў, форм і сродкаў, якія б дапамагалі развіваць мастацка-творчыя здольнасці дзяцей ва ўмовах сям'і. Аднабаковае духоўнае развіццё -- недахоп выхаваўчай работы ў сям'і, дзе фарміруецца чалавечая асоба.

Спецкурс «Мастацкае развіццё дзяцей у сям'і» дасць магчымасць не толькі сфарміраваць некаторыя ўменні і навыкі, неабходныя ў прафесійнай дзейнасці, але і дапаможа студэнтам, якія маюць сям'ю, атрымаць веды па пытаннях мастацкага развіцця дзяцей у сям'і, азначыць шляхі фарміравання гатоўнасці бацькоў да гэтай дзейнасці, вызначыць кампаненты такой гатоўнасці, знешнія і ўнутраныя яе ўмовы.

Сёння трэба паклапаціцца аб духоўнасці сям'і, закласці фундамент, неабходны для фарміравання культуры,якая абумоўлівае выхаванне і развіццё дзіцяці ў сям'і, вырошчванне ў яго душы такіх вобразаў, якія будуць садзейнічаць успрыманню дабра і характва.

Прафесійная арыентацыя сацыяльных педагогаў на работу у сям'і будзе садзейнічаць актуалізацыі і развіццю патэнцыялу студэнтаў.

**Бялоў У.І.,**
дацэнт

## ФАРМІРАВАННЕ Ў СТУДЭНТАЎ АРГАНІЗАТАРСКІХ УМЕННЯЎ ПРЫ ПАДРЫХТОЎЦЫ ПАЗНАВАЛЬНЫХ ПРАГРАМ У СОЦЫУМЕ

Арганізатарская дзейнасць па падрыхтоўцы і правядзенню пазнавальных праграм у соцыуме, як і любая іншая, складаецца з шэрага паслядоўных дзеянняў: унутраных (калі неабходна абмеркаваць тэму пастаноўкі, распрацаваць альбо знайсці сцэнарый, прааналізаваць магчымасці яго ажыццяўлення ў соцыуме і г.д.) і знешніх -практычных дзей (калі пачынаецца ўзаемадзеянне пастаноўшчыка праграмы з тымі, хто ўдзельнічае альбо глядзіць яе).

У працэсе пастаноўкі праграмы ў студэнта ёсць магчымасць паказаць арганізатарскія ўменні — здольнасць хутка і эфектыўна выкарыстоўваць арганізатарскія веды на практыцы, дзейнічаць з улікам вопыту і складанасці сітуацыі. Здольнасць да арганізатарскай дзейнасці ўключае таксама вострае назіранне, уменне арыентавацца ў абставінах і навакольным асяроддзі. Пры гэтым вядучымі ўласцівасцямі арганізатара пазнавальных праграм з'яўляюцца самастойнасць і ініцыятыўнасць, уменне прадбачыць вынікі ўздзеяння праграмы на аўдыторыю, настойлівасць у рэалізацыі задумы пастаноўкі.

Паспяховая арганізатарская дзейнасць залежыць ад шэрага абставін. Перш за ўсё ад ведаў тых асоб, з якімі студэнту неабходна будзе працаваць у соцыуме (магчыма, гэта будуць: дырэктар школы, гімназіі, каледжа, намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце, класны кіраўнік, выхавальнік дзіцячага садка і г.д.), ад ведання законаў развіцця калектыву (школьнага класа, групы дзіцячага садка, аматарскага аб'яднання), ад якасцей асобы арганізатара, яго знаходлівасці, смеласці, дысцыплінава-насці, ад ведаў асаблівасцей арганізатарскай працы і канкрэтнай справы, якую арганізуеш.

Арганізацыйна-пастановачная работа, якая ажыццяўлялася студэнтамі ў курсе спецыялізацыі «сацыяльны педагог», мела шэраг этапаў. Першы — абмеркаванне мэты і задачы пастаноўкі, другі — забеспячэнне неабходнымі сродкамі, размеркаванне абавязкаў сярод выканаўцаў, трэці – ажыццяўленне аператыўнага кіраўніцтва па рэалізацыі праграмы, аналіз эфектыўнасці, падвядзенне вынікаў пастановачнай работы.

Студэнту-арганізатару неабходна было ведаць не толькі паслядоўнасць дзеянняў, але і тое, што патрэбна рабіць на кожным этапе.

На першым этапе важна засвоіць змест арганізатарскай задачы, вызначыць галоўнае, убачыць дапаможнае.

У ходзе падрыхтоўкі праграм здараліся сітуацыі, калі студэнты як арганізатары канцэнтравалі свае магчымасці не на галоўных, а на другарадных задачах, таму што недастаткова зразумелі змест арганізатарскага задання.

На другім этапе вызначаецца паслядоўнасць выканання заданняў, высвятляюцца асноўныя ўмовы, тэрміны, матэрыяльныя сродкі, запрашаюцца ўдзельнікі.

На трэцім этапе неабходна канкрэтна ўзгадніць свае дзеянні з іншымі арганізатарамі ў соцыуме, назначыць канкрэтную дату правядзення праграмы, парадак рэпетыцый, вызначыць месца кожнага ў праграме.

У ходзе фарміравання ў студэнтаў арганізатарскіх уменняў і навыкаў звярталася ўвага на ўнутраныя перадумовы іх рэалізацыі — сабранасць і працаздольнасць, сціпласць і патрабавальнасць, дысцыплінаванасць і дакладнасць. Адсутнасць гэтых якасцей прыводзіць да разладу паміж магчымасцямі і рэальнымі справамі студэнтаў.

Назіранні ў ходзе арганізацыі пастановачнай работы вызначылі тое, што некаторыя студэнты не ўмеюць устанаўліваць дзелавыя кантакты з кіраўнікамі соцыумаў, быць дакладнымі і дысцыплінаванымі, вызначаць галоўнае і канцэнтраваць на ім свае намаганні.

Вынікі работы студэнтаў падводзіліся ў форме абмеркавання пастаноўкі, вусных і пісьмовых водгукаў на іх працу.

У якасці прыкладу скарыстаем некаторыя водгукі на пазнавальныя праграмы, якія праводзіліся студэнтамі ў школах, гімназіях, цэнтрах экалагічнага выхавання, дзіцячых садках.

«Праграма выклікала жывы інтарэс і актыўны ўдзел вучняў 6«а» і 6«б» класаў. Падлеткі былі задаволены тым, што гульні і пытанні былі цікавымі і пазнавальнымі...»

«Студэнты праявілі якасці добрых арганізатараў і вядучых. Прапанаваная імі праграма адзначалася цікавай задумай, карыснай пазнавальнай інфармацыяй».

«Студэнтка распрацавала добры сцэнарый і сама вяла праграму. У Наталлі вызначыліся здольнасці арганізатара. Яна была дакладнай і дысцыплінаванай».

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ